Przesyłka opłacona ryczałtem.

№ 3. Вільня, Панядзелак, 21 Сьнежня 1925 г. Год I.

СЯЛЯНСКАЯ НІВА

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
Вільня, Завальная вул. 7. — (Wilno, ulica Zawalna 7).

Рэдакцыя адчынена штодня ад 9 да 6 гадзіны апрача сьвята.

Газэта выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц 1 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

Перамена адрэсу 30 гр.

Цана асобнага нумару 20 гр.

Цана абвестак:

на 1 старонцы 30 грошаў, на 2 і 3 — 25 грошаў і на 4 — 20 грошаў за радок дробнага друку ў ваднэй палосцы. Жадаючыя іншых абвестак, павінны зьвярнуцца да Адміністрацыі.

Орган Беларускага Сялянскага Саюзу.

Усяму Беларускаму Сялянству, Чытачом і Прыхільнікам „Сялянскай Нівы“ шлём нашае найшчырэйшае Каляднае і Новагодняе пажаданьне!

Ці паможа?...

Польскі ўрад не на жарты ўзяўся лячыць гаспадарчыя і фінансавыя хваробы, на якія даволі паважна астатнім часам Польшч занемагла. Гэтая хвароба завецца жыцьцё над стан, а ўсе ўрадовыя лекі зводзяцца да таго, каб Польшч расходвала дзяржаўных грошай столькі, колькі яна сама з сябе можа здабыць. Сяньня ўжо гэта ўсе зразумелі і ўсе голасна аб гэтым гавораць.

Асабліва голасна і энэргічна аб гэтай справе загаварыў, як і трэба было спадзявацца, ўрад, які закідае Сойм сваімі праектамі розных уставаў, маючых на мэце палепшаньне гаспадарчае і фінансавае Польшчы.

Да гэтага часу ўрад унёс у Сойм аж чатыры такога роду ўставы; першая ўстава мае на мэце зьменшаньне платы чыноўнікам, вучыцялём, зменшаньне эмэрытуры, фундушаў на безработных, на касы хворых і інш.

Аб зьменшаньні самога ліку чыноўнікаў, устава гэта ня кажа нічога.

Другая ўстава даець права і абавязак міністру ўнутр. спраў сьлядзіць за тым, каб на рынку было даволі найпатрабнейшых спажыўчых прадуктаў, а дзеля гэтага ўстава гэта даець успомненаму міністру права і абавязак рэгуляваць вываз збожа, сьлядзіць, каб цэны былі адпаведныя і г. д.

Трэцяя ўстава гавора аб унутранай пяці працэнтавай даляровай пазычцы на пяць мільёнаў даляраў на пяць гадоў. Трэба ведаць, што ўрад ужо адну такую пазычку зрабіў. Але срок яе ўжо канчаецца, дык прыступае да другой.

Найцікавейшая ўстава чацьвёртая. Паводле яе ад сялян і агулам ад земляробаў, у пару не заплаціўшых падаткаў грашмі, можна ўзяць гэтыя падаткі прадуктамі. Усе гэтыя праекты уставаў, апрача апошняй, Сойм ужо прыняў. Тут мімаволі напрашаецца пытаньне, ці памогуць што ўсе гэтыя ўставы ў цяжкім палажэньні Польшчы? Мы, праўду кажучы, не спадзяёмся нічога добрага.

Уставы гэтыя нясуць з сабой толькі тое, што калі яны будуць уведзены ў жыцьцё, дык усім тым, што жылі з дзяржаўнага гроша, жыцьцё значна пагоршыцца, а каб яно каму палепшыла, дык гэтага ня відаца. Асабліва ня відаць гэтага палепшаньня для нашага сялянства, якому замест зьменшыць непасільныя падаткі і дапамагчы карысна гаспадарыць, дык з яго маюць браць залеглыя падаткі прадуктам. А што селяніну астанецца на пражыцьцё і на насеньне, — аб гэтым мала хто думае.

Чаму так востра ўрад узяўся за зьменшаньне выдаткаў і за такое вострае спаганяньне падаткаў,—для нас будзе зразумелым, калі прыпомнім тое, што эўропэйскія банкіры сказалі старшыні польскага ураду мін. Скшынскаму. А сказалі яны яму тое, што няхай Польшч не спадзяецца на заграічную пазыку, калі не перастане жыць над стан. Тымчасам у сучасным палажэньні Польшчы абыйсьціся без заграічнай пазычкі бадай што немагчыма. Дык дзеля гэтага ўрад і ўзяўся так востра раўнаваць дзяржаўны расход з прыходам. І ўсё гэта былоб няхай сабе, каб ды гэта раўнаваньне ня было такім балючым для мужыцкай сьпіны, а тымчасам сялянін сусім задыхаецца пад падаткавым цяжарам і гэта той сялянін, які ў Польшчы дзеля свайго ліку становіць падставу дзяржаўнай гаспадаркі.

Паводле нас нічога тут не памогуць ані гэтыя ўставы, калі ўрад ня зьверне належнай ўвагі на рэформу рольную і на гаспадарку селяніна, як на эканамічную апору, ані такжа што памогуць і розныя пазычкі, калі сяньня будуць заложаны розныя дзюры, а на справы сапраўды важныя і на заўтрашні дзень не астанецца нічога.!

Прынамсі так было дагэтуль і ня думаем, каб урад Скшынскага, як слушна назваў яго пасол Ярэміч: урад мест і капіталу проціў сялянства, цы палепшыў палажэньне.

Чаму падзяліліся?...

Пасля выхаду ў сьвет „Сялянскай Нівы“ сталі трохі яснейшымі тыя прычыны, якія давялі да падзелу у „Беларускім Пасольскім Клюбе“. Дагэтуль аб тых прычынах мала што пісалася. Тыя, што вышлі з Бел. Пас. Клюбу неяк маўчалі і нават ня выдалі ніякай дэклярацыі ў гэтай справе, **хоць абяцаліся гэта зрабіць**, а тыя, што асталіся—ня мелі свайго органу, каб праз яго адкрыць гэтыя прычыны і сказаць усім праўду.

Цяпер прычыны гэтыя трохі яснеі паказваюцца — і аб іх людзі пачалі гаварыць і пісаць.

Вот-жа галаўнымі прычынамі падзелу мела быць паводле слоў пасла Тарашкевіча тое:

1) што Беларускі Пасольскі Клюб стаяў за аўтаномію ў граніцах Польшчы, а выступіўшыя з гэтага клюбу стаялі за незалежнасьць Беларусі;

2) што разышліся ў зямельным пытаньні, пры чым астаўшыяся ў Бел. Клюбе не галасавалі за 30 гэктарамі, якія выступіўшыя хацелі пакінуць абшарнікам;

3) што Бел. Клюб не падпісаў камуністычнай праграмы ў зямельным пытаньні.

Вот і будуць, паводле слоў выступіўшага з Бел. Клюбу пасла Тарашкевіча, тыя прычыны, якія давялі да падзелу. Можа гэтым славам пасла Тарашкевіча людзі і паверылі і такім парадкам прычыны падзелу быліб „ясная“. Тымчасам як на бяду, паслы Рагуля і Ярэміч пачалі пярэчыць словам Тарашкевіча, дык справа яшчэ болей запуталася. Гэтыя паслы ў 1 № „Сялянскай Нівы“ пішуць, што справа самаазначэньня народаў і незалежнасьці Беларусі была за'яўлена ня кім іншым, як толькі паслом Рагуляй у 1924 годзе, калі ён быў старшынёй Бел. Пас. Кл., дый аб'яўлена гэта было ад імяні ўсяго Клюбу яшчэ здаўна перад падзелам... Дык чаму п. Тарашкевіч падае такія прычыны?

А другою з прычынаў падзелу мела быць тое, што Тарашкевіч і другія выступіўшыя сябры хацелі пакінуць абшарнікам па 30 гэктараў, а сябры астаўшыяся ў Бел. Клюбе стаялі за 20 гэктараў. Мне здаецца, што абшарнікам ня можна пакінуць і 20 гэктараў, а пакінуць столькі, сколькі выпадзе на трудавую норму. А можа на трудавую норму ня выпадзе па 20 гэктараў, а па 10, то з якой ласкі кідаць яму 20 гэктараў, ужо не гаворачы аб 30 гэктараў, як гэта хоча пасол Тарашкевіч! Калі так, то і гэта прычына ў вачах усяго грамадзянства выглядае неяк дзіўна і прычынай падзелу быць не магла.

А трэцяй прычынай мела быць тое, што цяперашнія сябры Клюбу не падпісалі камуністычнай праграмы ў зямельным пытаньні—і тут ужо сябры Бел. Клюбу Рагуля і Ярэміч прызнаюцца, што сапраўды такой дэклярацыі не падпісалі. Вот гдзе крыецца тая прычына, каторая давяла да такога сумнага падзелу.

Разглядаючы гэтыя прычыны і бяручы іх пад развагу, неяк дзіўным выдаецца тое, што п. Тарашкевіч паказвае аж тры прычыны, тагды калі сапраўды была адна. Штож тут такое?

А добра былоб ведаць акуратна ўсе тыя прычыны, бо гэты падзел у жыцьці Беларусі мае вялікае значэньне і трэба, каб паслы перад усім народам голасна прызналіся да прычын, якія выклікалі гэтае сумнае зьявішча і давялі да падзелу—тады, калі найболей патрэба дружнасьці і салідарнасьці. А аб гэтым мог-бы, здаецца, найлепш і найболей сказаць п. Тарашкевіч, каторы прычыніўся да зламаньня агульна-беларускага фронту.

Горскі.

ГРАМАДЗЯНЕ!

На наш заклік у першым нумары „Сялянскай Нівы“, многія атклікнуліся, высказваючы сваю прыхільнасьць да яе. Але гэтага мала. Трэба, каб якнайшырэйшыя масы, узялі шчыра да сэрца свой лёс сялянскі і падтрымалі нас падпіскай, добрай радай, весткамі.

Дык усіх сялян і ўсю сялянскую інтэлігенцыю заклікаем пад сьцяг „Сялянскага Саюзу“ і да падтрыманьня сваей роднай, клясовай, сялянскай газэты!

РЭДАКЦЫЯ.

МУЗА — ДЗЯЎЧЫНКА.

У былыя дні кахалісь мы з табой.
Ты прыхадзіла чыстая, сьвятая,
Душой свая, жыцьцём чужая,
Нявідная таўпе людзкой.
Ты прыхадзіла з песьняю нячутнай,
Блізкаю, роднаю, магутнай,
Ды слоў чужых няясны зык
Мяне страшыў і твар твой сумны
З вачэй маіх надоўга знік.
Дарэмна ў гоман сьвету шумны
Услухаўся я: жыцьцё цякло
Сваім старым абычным шляхам,
Пісала казку буйным махам,
Хаўтуры і жальбы нясло.
. . . .
Зноў цябе я напаткаў.
Мы ўспомнілі пару каханьня;
І быццам доўгага расстаньня
У нас ня было; я ўсё пазнаў:
Вачэй тваіх агонь таёмны,
Твой сьмех дзіцячы, узгляду чар;
Ты распаліла сэрца жар, —
З тых пор я дзікі і бяздомны.
Няма мне мейсца між людцоў,
Я ў чужым сьмеху сьлёзы бачу,
Мой дом пасярод ніў, лясоў,
Там мая радасьць, там я плачу.

Міхальскі.

Прауда аб Беларусі.

Вынясьлі раз пастанову
Даць сьвяточную абнову
Для батрачкі Беларусі.
Апранулі тым і гэтым
На дзіў, зайздрасьць ўсім кабетам —
То завяліка, то душыць.
Клікнулі краўцоў з усходу —
Навярнула іх з заходу.
Дагадзіць ніхто ня можа.
Ўрэшце ніваю - тканінай
Беларусь - красу дзяўчыну
Селянін сам апрыгожыў.
Зноў рашылі дабрадзеі
Выдаць замуж нашу жнею
За багатага суседа.
Панічы таўкліся хмарай.
А працоўніца ім жара:
— Не пайду за дармаеда!
І купец - бруках з усходу,
Шляхціц - махціц аж з заходу
Хвігу зьелі такжа жвава.
Бо сялянін быў ёй мілы,
З ім на век саюз зрабіла
Дзеля шчасьця, добрай славы.

Алёна.

Зямельнае пытаньне у Заходняй Беларусі.

У папярэднім нумары нашае газэты было гаворана аб тым, як хоча разьвязаць зямельнае пытаньне Беларускі пасольскі клюб.

Але гэта залежыць ня толькі ад Беларускага клюбу, але ад цэлага Сойму, і дзеля гэтага усякаму будзе цікава ведаць, якую-ж зямельную рэформу ў Польшчы у Заходняй Беларусі хоча правесьці Сойм.

Яшчэ летам Сойм прыняў уставу аб парцэляцыі і асадніцтве, якая мусіць заступіць зямельную рэформу. Гэная ўстава прынята Сэнатам з пэўнымі папраўкамі і ўвойдзе ў жыцьцё ў наступным 1926 годзе.

Разглядзімо, што-ж гэта за ўстава, і што можа з яе скарыстаць наш селянін?

Дзеля гэтага мусімо ведаць: 1) На што зямля бярэцца, 2) ад каго зямлю маніцца ўрад узяць, 3) Сколькі яе будзе ўзята на парцэляцыю, 4) На якіх варунках яе будуць забіраць і даваць і 5) каму яе будуць даваць.

Згодна з артыкулам першым уставы, яна мае на мэце тварэньне новых невялікіх асобных гаспадарак, павялічваньне істнуючых маленькіх гаспадарак, ці наданьне зямлі малазямельным, тварэньне малых гаспадарак — агародніцкіх, урэшце выдзяленьне калёніяў работніцкіх і чыноўніцкіх.

На гэтыя мэты пойдзе зямля казённая, зямля былых банкаў сялянскага, шляхоцкага (Дваранскага) царкоўная, касьцельная, манастырская і частка памешчыцкай. З гэтае астатняе маёнткі, якія былі забраны расейскім урадам ад палякоў за паўстаньне і адданы ці нават праданы другім асобам, будуць узяты цалком, нявыключаючы вазёр і лесу. Прыватным уласьнікам будзе застаўляцца 180 га зямлі аромай і сенажаці, апроч лесу, які не забіраецца саўсім. А на землях беларускіх, літоўскіх і украінскіх паном заставяць па 300 га.

Ня будуць забірацца і тыя маёнткі, хоць-бы яны былі і большыя як 180 га, а ў нас 300 га, у якіх гадуюць добрае быдла, добрае насеньне ці агулам надта добра гаспадараць. Агульны абшар такіх гаспадарак ня можа быць у ва ўсей Польшчы большы, як 550,000 гэктараў.

Згодна з артыкулам 8 уставы Міністар зямельнай рэформы будзе мець права купляць на парцэляцыю і асадніцтва тыя маёнткі, уласьнікі якіх дабравольна згодзяцца іх прадаць.

Усякі год, покуль ня будзе вычарпаны ўвесь запас зямлі, будзе парцэлявацца столькі зямлі, сколькі ўстановіць Міністэрства зямельных рэформ. А ў працягу найбліжэйшых 10 гадоў ня меней, як 200000 гэктараў што год. Ад прыватных уласьнікаў зямлю будуць забіраць нават прымусова, але за выкуп.

Цана выкупу будзе складацца з цаны зямлі, будынкаў, лесу (калі такі забіраецца), выдаткаў на мэліорацыю (асушка балота і іншыя) і нават цаны вады.

Гэтая цана будзе дапасавана да тэй цаны, ў якой аблічваўся падатак маёнткові.

Плату за зямлю памешчыкі атрымаюць часьць гатоўкаю, часць працэнтнымі паперамі.

Пры падзеле зямлі, згодна з артыкулам 44, павінны быць узяты пад увагу правы службы дворскай, якая траціць працу, калі маёнтак дзеліцца (парцэлюецца), а так-сама павінна быць выдзелена зямля ў меру патрэбы (як кажа ўстава) жаўнерам польскіх войск і вайсковым ахвотнікам.

Асобныя, утвораныя на моцы гэнае ўставы, гаспадаркі не могуць быць большыя, як 25 гэктараў у Польшчы і 45 гэктараў на так званых Крэсах Усходніх.

Парцэляваная зямля можа быць узята на павялічваньне маленькіх гаспадарак блізкіх вёсак і на выдзяленьне самастойных гаспадарстваў. Але калі Міністэрства знойдзе патрэбным, то можа аддаць яе цалком на адну з гэтых мэтаў.

Можа быць яшчэ і інача: зямля можа быць вызначана на прадажу грамадзянам паветаў, якія надта густа населены. У гэтым выпадку Міністэрства мусіць даць зямлю дворскай службе, якая страціла працу з прычыны падзелу маёнтку, у іншых маёнтках. Калі-ж яны не захочаць атрымаць зямлі, то Акружное Зямельное Упраўленьне, павінна заплаціць ім па 500 злотых, за ўтрату працы.

Набываць зямлю будуць мець права грамадзяне Польскай рэспублікі, якія займаюцца земляробствам, ці дакажуць у які інакшы спосаб, што яны падгатаваны весьці гаспадарку, а гэтак сама і зямельныя таварыства, калі ўсе члены іх будуць адпавядаць вышэй азначаным варункам.

Ня могуць атрымаць зямлі тыя, хто быў пакараны за праступленьне проціў Польскай Дзяржавы, уцёк з польскага войска, ці тыя, хто самавольна захопліваў чужую зямлю.

Згодна з § 52 уставы, пры ўсякай парцэляцыі сярод кандыдатаў на зямлю, маючых аднолькавыя правы, у першую чаргу атрымаюць зямлю бышыя арэндатары і офіцыялісты (цівуны, эканомы) парцэляваных маёнткаў, потым заслужаныя жаўнеры і ахвотнікі польскага войска, сем'і (удовы ці сіроты) застаўшыхся па забітых жаўнерах ці ахвотніках польскіх і скончыўшыя навуку ў земляробскіх школах.

Зямля, якая будзе атрымана на падставе гэнае ўставы, да часу пакуль ня будзе выплачана, ня можа быць ані дзелена, ані аддавана ў арэнду, ані прадавана бяз згоды на гэтае Зямельнага Упраўленьня.

Калі зямля будзе нават дакуплена да істнуючай гаспадаркі, дык гэтыя варункі датычаць усей гаспадаркі.

Парцэляваць зямлю будуць Акружныя Зямельныя Упраўленьня.

Усе тыя, хто будзе атрымліваць зямлю, пры пачатку павінны будуць адразу заплаціць задатак ад 5 да 50% яе ацэнкі. Усякая зямля, нават казённая, будзе даваца за выкуп. Цаны устава не ўстанаўліае, але толькі гаворыць аб тым, каб яна ня была надта высокая, аб чым павінна рашаць Акружная Зямельная Камісія.

На атрыманьне зямлі ўстава прадбачыць запамогу з Зямельнага Банку, на падставах, якія выпрацуюць Міністэрства Зямельных рэформай і Міністэрства Скарбу.

Найбольшая запамога, паводле уставы, будзе давацца работнікам маёнткаў і жаўнерам, нават аж да поўнае цаны зямлі. Зварот пазычкі начнецца праз 5 гадоў па атрыманьні зямлі.

Незалежна ад гэтага ім можа быць дана пазычка па лягчэйшых варунках на загаспадараваньне лікам каля 2,500 злотых.

Вот кароткі агляд закону аб парцэляцыі і асадніцтве. Па Калядах Сойм скончыць разгляд папраўак Сэнату і закон будзе апублікаваны.

Як заглядаюцца на гэны закон Беларускія паслы з боку абароны інтарэсаў нашага сялянства і чаго яны дабіваліся пад час абгаварываньня яго ў Сойме, напішам у наступным нумары.

Пасол Сойму
В. Рагуля.

Аграрная перанаселенасьць БССР і меры барацьбы з ею.

Мы стаімо перад фактам аграрнай перанаселенасьці тэрыторыі БССР.

Каб хто сказаў нам аб гэтым гадоў дзесяць таму назад, то мы-б не паверылі і нават зьдзівіліся-б. Нам здавалася, што Беларусь ня толькі не перанаселена, але, наадварот, — што ў яе ёсьць многа земель, якія пустуюць і маглі-б быць пригодныя пад поле, трэба толькі высушыць балоты, выкарчаваць зарасьлі, абрабіць дабытыя прасторы пры помачы найноўшых культурных способаў — і зямлі ўсім хопіць аж па горла.

[illegible]к нам здавалася, а многім здаецца і цяпер, як у [illegible]-у БССР, так і ў Заходняй Беларусі, якая зна[illegible]
Т[illegible]а пад Польшчай. Паміж іншым, там у Польш-
нас[illegible]д на Беларусь, як на вельмі слаба заселены
ходзіц[illegible]ты кіруючымі палітычнымі сфэрамі за ас-
чы—пагл[illegible]ыйнай „асадніцкай" палітыкі, і Заход-
край, прын[illegible] калёнізуюць выхадцамі з Польшчы.
нову калёніза[illegible] тэрыторыя Беларусі (БССР і Зах.
нюю Беларусь [illegible] што яе ня толькі ня можна ка-
Мы-ж лічым, што [illegible].—што частку яе насяленьня
Бел.) перанаселена і [illegible]ча вольныя землі, дзе яны
лёнізаваць, а, наадваро[illegible]д.). У нас самых толькі
трэба было б перасяліць [illegible]о-б разсяліць лішку на-
ёсьць. (Падчоркнута намі. [illegible]х асушкі балот.
ў Мазырскай акрузе можна бы[illegible]арусі сягае 60-х
сяленьня, але толькі пры варунк[illegible]ншчыны. Тагды

Пачатак перанаселенасьці Бе[illegible]чарназёмнай
гадоў, калі сяляне вызваліліся з-пад п[illegible]амалы, так
ўжо надзел ад $3^1/_2$ да 8 дзесяцін для[illegible]ў з цяж-
паласы (а, значыцца, і для Беларусі) быў [illegible]
[illegible]то сялянства змушана было шукаць выхада[illegible]
[illegible]кіх варункаў жыцьця.

У сувязі з прыростам насяленьня колькасьць зямлі на кожнага жыхара вёскі з кожным годам зьмяншалася, ня гледзячы на тое, што плошча сялянскага землякарыстаньня пашырылася на кошт панскіх і іншых земель, і к 1917 году характарызавалася лічбамі:

Губэрні	Гады	Лічба дзесяцін зямлі на адну гаспадарку: усёй	У тым ліку пашы
Віцебская			
	1877	13,3	8,5
	1905	12,6	—
	1917	10,1	5,1
Менская			
	1877	18,4	11,2
	1905	12,3	—
	1917	11,0	5,0
Магілёўская			
	1877	12,6	7,4
	1905	11,3	—
	1917	10,3	5,3

Такім чынам, за 40 гадоў сялянскі надзел значна зьменшыўся, і к 17 году процант паменшаньня быў па губэрнях такі: Віцебскай — 24,0 проц., Менскай — 40,2 проц. і Магілёўскай — 16,6 проц.

Прычын такога зьявішча трэба шукаць у надзвычайна інтэнсыўным прыросьце насяленьня.

Па даных Цэнтральнага Статыстычнага Камітэту за 16-ці гадовы пэрыяд ад 1897 да 1913 году прырост насяленьня быў такі:

Губэрні	Гады	Лік людзей	Проц. прыросту
Віцебская	1897	1489246	39,0%
	1913	2070652	
Менская	1897	2147621	39,1%
	1913	2992443	
Магілёўская	1897	1686764	41,9%
	1913	2391909	

Параўнаем дзеля цікавасьці прырост насяленьня ў БССР з прыростам у іншых дзяржавах у 1923 г.

Дзяржавы:	% прыросту
БССР	2,41
Гэрманія	1,55
Японія	1,24
Данія	1,10
Злуч.-Штаты	1,06
Англія	0,82
францыя	0,24
Індыя	0,10

У бышых губэрнях, складаючых цяпер БССР, прырост насяленьня на 1000 жыхароў раўняўся: у 1909—18,6, у 1923—24,1 і ў 1924—27,8.

Зусім нармальна, што пры такім надзвычайна інтэнсыўным працэ росьце насяленьня адбываецца такі-ж інтэнсыўны працэс драбленьня сельскіх гаспадарак, і таму зямельная плошча, якая знаходзіца цяпер ў карыстаньні сялянства, не здавальняе яго прыросту.

У параўнаньні з іншымі краямі, што ўваходзяць у Саюз СС Рэспублік, БССР найбольш густа заселена,

З Краю.

Дзісьненшчына і беларускія школы.

Усім ведама, що Дзісьненшчына, як іншыя бе-арускія паветы, злажылі дужа многа дэклярацыяў на еларускія школы. Тымчасам школ, як ня было, так няма.

Праўда, як даведваемся, у Дзісьненшчыне быццам ткрываюцца толькі школы двуязычны: у вёсках асноўка і Сьнегі гм. Ёдскай, у в. Казакі, гм. Нова-агоскай, у Шаркаўшчыне, у в. Жадэйкі, гм. Глы-оцкай і ў в. В.-Сяло, гм. Г рманаўскай. Але што еларусам з гэтых школ? Мала таго, што іх толькі екулькі, дык яны маюць быць двуязычныя, а ў іх маюць вучыць беларусаў сусім няведамыя людзі, над-а магчыма, што нават няўмеючыя беларускай мовы.

Паліцэйская правакацыя у Косаўшчыне.

15 — 16 сьнежня у Гарадзенскім Акружным удзе разглядалася справа 10-х палітычных. Абві-яліся: Мікалай Пераралоцкі, Ціхан Кулініч, Пётр учыц, Павал Труцько, Язэп Марчык, Трафім мотко, Міхась Калтун, Мікалай Дзямідовіч, Міка-ай Кулініч. Усіх абвінавачвалі з артыкулу 102 К. ., які гразіць многімі гадамі катаргі. Абвінава-аныя прасядзелі ў вастрозе па 16 месяцоў і з іх зевяць чалавек суд прызнаў зусім нявіноўнымі, аднаго Дзямідовіча засудзіў на 1 год крэпасьці залічыў тое, што ён прасядзеў. На судзе выясьні-ася, што ўся гэта справа была чыстай вады пра-акацыяй Косаўскай палітычнай паліцыі. Мікалай ераралоцкі перад арыштам быў кіраўніком сэкрэ-ар'яту Бел. Пасольскага Клюбу і гэта было бяль-ом у воку Косаўскай паліцыі. Пастанавілі з гэ-ага зрабіць справу, дык і зрабілі. Нікаторых да этага моцна пабілі.

Цяпер я пытаюся, хто-ж зьверне пацярпеў-ым іх здароўе, хто-ж надгародзіць ім за тую рыўду маральную і матэр'яльную, якую зрабілі ім аны паліцыянты? Ці няварта былоб пасадзіць вастрог п. п. Цыганкевіча, Жака і Ауксеньцья-а хоць на столькі-ж, сколькі прасядзелі іх ахвяры?..

Падарожны.

З Польшчы

Што прывёз Скшынскі?

Як ведама прэм'ер Скшынскі езьдзіў у Эўропу, аб дастаць грошы. Паміж іншым быў у Лёндыне і га-арыў з ангельскімі і амэрыканскімі банкірамі у спра-е пазычкі для Польшчы. Аднак з гэтага нічога ня ышла, бо вярнуўшыся ў Варшаву Скшынскі сказаў ось што: **Польшча не атрымае ад банкіраў ні грошы-а, аж покуль ня будзе зраўнаважаны польскі бюджэт, начыцца, пакуль расход ня будзе раўняца з даходам.** Вось што прывёз Скшынскі з заграніцы! Затым цяпер рад працуе над тым, каб „абрэзаць“ расходы на якіх 00 міл. злотых. Трэба ведаць, што расходы ў Поль-чы правышшалі 2 мільярды зл., а даходы ледзь-ледзь ахадзілі да 1 мільярда 500 мільёнаў зл. дык вот ду-аюць бюджет змнейшыць да гэтых 1½ мільярда зл., аб гэтым зраўняць яго з запраўднымі даходамі. Але і гэта ўдасца? Нам здаецца, што пры цяперашнім істаньні злотага, гэтага зрабіць немагчыма, бо калі, апусьцім, напішаць бюджэт на 1½ мільярда, то хто едае, ці за які месяц пры спадку злотага ня трэба удзе гэты бюджэт павялічыць?... І так без канца...

Значыцца, пазычка залежыць ад зраўнаваньня юджэту, бюджэт залежыць ад сталасьці злотага, а злот алежыць ад гаспадарчага палажэньня Польшчы... і ад азычкі — вот і будзе тое замкнутае кола, з каторага выйсьці трудна! Паглядзім, як п. Скшынскі з гэтага выйдзе... Дагэтуль яшчэ круціцца ў гэтым блудным коле...

Хатні арышт п. Ліндэ.

Судзьдзя сьледчы загадаў арыштаваць п. Ліндэ, быўшага старшыню П. К. О. (Polskiej Kasy Oszczędnościowej). Гэты пан з народных грошай, складаных у гэту касу прысвоіў сабе вялікія капіталы, а таксама шмат „распазычаў“ сваім прыяцелям і сваякам... Цыфра пакражы вышла нешта аграмадная. Але пана „старшыню“ злавілі на пакражы і пацягнулі да судовай адказнасьці, а нават арыштавалі, назначыўшы 300 тысяч злотых каўцыі. Трэба дадаць, што п. Ліндэ займаў у Польшчы высокія становішчы.

Пакража пашпартовых кніжак.

У міністэрстве Унутр. Спраў выкрылі вялікую пакражу, бо аж 500 штук пашпартовых кніжак. Улады ўзяліся за сьледзтва, бо гэта пакража для ўраду вельмі небяспечная.

Канец працэсу Штэйгера.

17 сьнежня закончыўся ўрэшце працэс Штэйгера, якога вінавацілі ў тым, што быццам ён кінуў бомбу ў прэзыдэнта Войцеховскага ў бытнасьць апошняга ў Львове. Працэс трываў паўтара месяца і закончыўся поўным апраўданьнем Штэйгера.

Безрабоцьце шырыцца.

Лік безработных у Польшчы з кожным тыднем павялічываецца. Да 5 сьнежня налічылі 261.851 безработных. За адзін тыдзень лік узрос на 12.185 безработных. Калі гэтак далей пойдзе, то будучына работнікаў даволі сумная, тым болей, што ў Лодзі фабрыкі становяцца і промысл замірае.

Эміграцыя ў Палестыну.

Паводле даных статыстыкі за лістапад с. года з Польшчы выэміграваля 80 жыдоўскіх сем'яў, большасьць іх выехала ў Палестыну. Апрача таго ў тым-жа месяцы выселена ў Літву і Расею па 1 сям'і.

З Радавай Беларусі.

Усебеларусная мастацкая выстаўка.

Праца дзеля адчыненьня ў Менску Усебелр. мастацкай выстаўкі ідзе напружаным тэмпам. Працуе экспэртная камісія, якая вядзе прагляд і адбор паступіўшых экспанатаў. Наплыў апошніх нечакана, але прыемна, вялікі, што абяцуе выстаўку зрабіць цікаваю і цэннаю для пачатку сталае працы ў галіне вобразных мастацтваў. З Віцебску ад працоўнікаў і вучняў Мастацкага тэхнікуму прыбыло 12 скрынак экспанатаў (да 400 №№).

У сьлед за сканчэньнем працы экспэртнае камісіі распачнецца разьвеска і расстаноўка аэкспанатаў, складаньне і друкаваньне каталёгу. Выстаўка адчыніцца ў найбліжэйшыя дні.

Узрост беларускіх народных уплываў.

На 9-ым зьездзе Кам. Партыі ў Менску, як падае „Звезда“ у дыскусіі над рэфэратам Крыніцкага, кам. Нусінаў сцьвярдзіў „узрост уплываў дробнамяшчанскае інтэлігэнцыі беларускай і завострэньне народных адносінаў з вялікарусамі“. Зьезд пастанавіў застасаваць проці гэтых уплываў „цьвёрдую руку“.

З Заграніцы.

Сырыя.

Сырыя, дзе цяпер французы ваююць, гэта багатая краіна ў Азіі над Сяродземным морам, ласы кусок для эўрапэйскіх капіталістаў.

Сырыя была калісь пад панаваньнем Турэччыны. Цяпер ей апякуюцца Французы і Англічане. Апека гэтая ня выходзе на дабро жыхаром Сырыі і яны стараюцца пазбыцца гэтае апекі.

Сёлета зрабіла паўстаньне, проці француэкага панаваньня, адно невялікае племя Друзы. Адбываюцца вялікія баі, каштуючыя ужо Францыі некалькі тысячаў жаўнераў. Паўстаньне, яшчэ ня здушана, а пашыраецца ўсё больш.

Нядаўна невялічкая група паўстанцаў падышла да вялікага места сырыйскага Дамаску. Французы злавілі іх і, для пастраху, пазабіваўшы паскладалі на вярблюдаў і пачалі абвазіць на вуліцах м. Дамаску. Гэта так узбурыла жыхароў места, што яны кінуліся на французаў і выразалі нескалькі дзесяткаў.

Французы, каб памсціцца, прызвалі больш войска і праз 2 дні абстрэлівалі места Дамаск з гарматаў, у часе якога згінула больш як 2000 людзей і цэлае места бадай што знішчылі.

Па знішчэньні Дамаску запанавала яшчэ большае абурэньне, пры тым, ня толькі Друзаў. Да паўстаньня прылучыліся Арабы. Цяпер увесь паўстанчы рух ідзе пад клічам: Проч з Французамі, Англічанамі і Італьянцамі! Мусульманскія землі для мусульманаў! Французы сцягаваюць новыя сілы з Морокка, але дзеля таго, што сярод войска француэкага найбольш ёсьць чорных, магамэтам, якія спачуваюць паўстанцам, з усьмірэньням паўстаньня нічога ня выходзе. За апошнія месяцы паўстаньне гэтае прыймае характар сьвятой вайны Магамэтан проці эўропэйцаў.

Нямецкія стараньні аб пазыцы.

„Pat“ паведамляе, что Гільбэрт Паркэр і Нэрман выежджаюць у Амэрыку; мэта гэтае падарожы: ёсьць стараньне новых крэдытаў для Нямеччыны.

Расейска-Японскі дагавор.

15 сьнежня быў падпісаны концесыйны дагавор між Расеяй і Японіяй. Паводле дагавору часьць капальняў каменнага вугля, на паўночным Сахаліне, пераказываецца на 45 г. фірмам, якія вызнача японскі ўрад. Ад імя саветаў дагавор падпісалі Дзержынскі і Літвінаў.

Гутарка з Чычэрынам.

„Pat“ падае гутарку з Чычэрынам, які ўважае, што Ліга Народаў ня можа даць гваранцыі запраўднага міру, а Лёкарно (дагаворы) ёсьць пачаткам чагось незнанага. Гутарку Чычэрын закончыў славамі, што істнаваньне Радавага саюзу ёсьць фактам. Калі гэта будзе ўзята пад увагу, дык паразуменьне Англіі з Расеяй ня будзе трудным.

Гутаркі Чычэрына з Бріанд'ам.

„Le Journal“ даносе, што гутаркі Чычэрына з Бріанд'ам датычылі ўсіх спраў, будучых на парадку дня. На гэтых днях адбудзецца ізноў размова, пасьля якой Чычэрын і Ракоўскі паедуць у Маскву, каб паведаміць свой ўрад аб выніках гутаркі. У палове студня Ракоўскі вяртаецца і тады ўжо пачнуцца запраўдныя перагаворы. Са стараны Французаў уважаецца за найважнейшыя справы, гэта: урэгулеваньне царскіх даўгоў і паварот Расеі да эўрапэйскае палітыкі, што наступе тады, калі Саветы перастануць вясьці прапаганду, пад пакрыўкай III-га Інтэрнацыяналу.

а выключэньнем цэнтральна-прамысловага раёну. Па аных праф. Даганоўскага, гушчыня насяленьня па озных раёнах СССР выяўляецца гэтак:

Раёны:	Сельска-гасп. гушчыня на 100 дзес.
БССР	69,5 чал.
Цэнтр.-Прамыс.	70,1 „
УССР	65,2 „
Паўночна ўсходні	64,5 „
Вяцка-Вятлускі	47,8 „
Паўночна-заходні	45,3 „
Урал	34,1 „

Прыняўшы пад увагу тое, што ў цэнтральна-рамысловым раёне насяленьне пераважна працуе а фабрыках, а сельск. гасп. цікавіцца, як заняткам пад-обным, і што ў іншых раёнах заселеных амаль так-а густа (УССР), як БССР, зямля нямнога лепшая, рэба канстатаваць факт перанаселенасьці БССР, што ідаць і з даных аб ураджаях за перыяд ад 1909 да 913 г. у розных раёнах Саюзу.

Збор з аднае дзес. у пуд.

	Жыта	Ячмень	Авёс	Бульба
БССР	49	49	50	444
РСФСР	55	51	75	450
УССР	63	66	70	505

Пры ўсім тым, у нашай рэспубліцы няма такой азьвітай, як у іншых раёнах, прамысловасьці, і таму, нашае сялянства ня можа знайсьці ў сябе на месцы пабочных заработкаў, а павінна шукаць іх па другіх раёнах СССР, **або перасяляцца на новыя месцы — пераважна ў Сібір.** (Падчоркнута намі. Рэд.).

„Итоги переселенческого движения в России“ за 1903 год паказваюць, што на першым месцы па лічбе перасельнікаў стаяць губэрні: Магілёўская—9886 чал., Віцебская—9850 чал., Палтаўская—7311 чал. і на 7 месцы Менская—3461 чал. Гэтыя данныя найлепш сьведчаць аб перанаселеннасьці БССР і аб шуканьні яе насяленьнем выхаду з крытычнага становішча сельскай гаспадаркі яшчэ ў 1903 г.

Наскольні ёсьць вялікая цяга да перасяленьня ў сучасны момант, відаць з даных аддзелу перасяленьняў Наркомзему. З 1923 г. да 20 красавіка 1925 году перасяліліся 1886 сем'яў, а ў іх 12246 душ — і гэта пры самых цяжкіх грашовых і іншых варунках. З 1-га студзеня да 1-га красавіка падало заяў аб перасяленьні 5125 сем'яў і ў іх 30.070 душ. (Падчоркнута намі. Рэд.).

З матэр'ялаў аб невыкарыстаньні рабочае сілы ў сялянскай гаспадарцы за 1922—1923 і 1923—1924 г. г. па БССР мы бачым, што нашае сялянства толькі каля 40 проц. свайго рабочага часу траціць на заняткі сельскай гаспадаркай і, такім чынам, рэшта энэргіі або ідзе на негаспадарчыя заняткі, або прападае, бо няма чаго рабіць.

А насяленьне ўсё прыбывае і прыбывае. Лічба народзінаў і ўпадку сьмяротнасьці, асабліва дзіцячай, яскрава сьведчаць аб гэтым. Памерла да 1 году на 100 нарадзіўшыхся:

	У 1909	1923	1924
У гарадох	20,92	8,88	9,59
У сельскіх мясцов.	16,41	8,95	8,22
Па рэспубліцы	16,79	8,94	8,34

За 1923 год прырасло насяленьня ў БССР 96,233 і за першую палову 1924 г.—57,140 чал., пры гэтым, на долю сялянскага насяленьня прыходзіцца 90,7 пр. у 1923 г. і 92,6 проц. у 1924 г. ад агульных лічбаў усяго прыросту па рэспубліцы.

Ніякімі, самымі радыкальнымі, мерапрыёмствамі для палепшаньня культуры сельскіх гаспадарак і зьвязанымі з гэтым іншымі способамі палепшаньня быту сялян, як разьвіццё прамысловасьці наагул і каапэрацыя і г. д. — мы не пазбавіліся перанаселенасьці нашае тэрыторыі, бо ня можна ўгнацца за надзвычайна інтэнсыўным прыростам насяленьня.

Барацьба з сельска-гаспадарчаю перанаселенасьцью павінна адбывацца ва ўсіх кірунках; трэба зьніштажаць церазпалосіцу, далёказямельле і карлікавыя гаспадаркі; трэба шырока разьвярнуць мэліарацыйныя работы з мэтаю ліквідаваць забалочанасьць (асабліва ў Мазырскай акрузе); трэба арганізаваць крэдыт сялянскім гаспадаркам у кірунку яго павялічэньня і патаненьня; трэба арганізаваць збыт с.-г. прадуктаў, перааапрацаваўшы іх у больш рынчны выгляд; трэба даць сялянству добрае насеньне, жывы і мёртвы інвэнтар і г. д. **Гэтыя мерапрыёмства бязумоўна зьменшаць зямельны крызіс, але ня знішчаць яго і таму апошнім сродкам супроць перанаселенасьці БССР зьяўляецца перасяленьне беззямельных і малазямельных на вольныя землі ў іншыя раёны СССР.** (Падчыркнута намі. Рэд.).

М. Л—н.

(„Савецкая Беларусь“ 27.X. 1925).

Чычэрын прыедзе ў Варшаву.

З кругоў зблiжаных да савецкага пасольства ў Варшаве даносяць, што Чычэрын, едучы ў Маскву, затрымаецца ў Варшяве на некалькі дзён. У Варшаве Чычэрын абгавора з урэдам усе справы зьвязаныя з навязаньнем нармальных зносінаў гаспадарчых між Саветамі і Польшчай. А так-жа мае быць усталены час паезду польскага мін. загр. спраў у Маскву.

Расейска-Кітайскія адносіны.

Газэты пішуць, што генэрал Фэнг заключыў дагавор з Савецкім урадам. Паводле гэтага дагавару маюць быць праведзены дзьве чыгункі ў Манголіі, якія-б лепш лучылі Кітай з Расеяй; Расея абавязуецца даць 18 мільёнаў франкаў францускіх Фэнгу, як вайсковае помачы. У разе вайны між Саветамі і іншай дзяржавай, Кітайская рэспубліка высылае на помач $^{1}/_{3}$ свайго войска, а Расея, у падобным выпадку, дае Фэнгу 50.000 жаўнераў.

Цяперашняя Савецкая Расея.

У апошнім гадавіку савецкага статыстычнага бюра знаходзяцца гэткія даныя аб саветах.

Насяленьня ў Расеі цяпер налічаваецца 132.000.413 жыхароў сталых і 1.200.000 эмігрантаў разных народаў. Уся тэрыторыя падзелена на 10 рэспублік самастойных і 11—аўтанамічных. Апроч гэтага саветы арганізуюць аўтанамічныя рэспублікі: польскую і жыдоўскую на Падоліі, Валыні, Кіеўшчыне і Херсоншчыне. З усяго насяленьня СССР вялікарусаў ёсьць 52%, іншых нацыянальнасьцяў 48%. Праваслаўнага насяленьня ёсьць 82%. Зямля падзелена так, што сяляне атрымалі 97%, а астальная пашла на гаспадаркі дзяржаўныя і вайсковыя,

Ангельская пазыка Літве.

Міністар фінансаў Карвэліс сказаў, што Літоўскі ўрад дайшоў да паразуменьня з ангельскімі капіталістамі ў справе пазыкі на суму 3 міл. фунтаў штэрл., з чаго 1 міл. мае атрымаць у таварах.

Збор на „вызваленьне“ Вільні.

„Elta“ даносе, што збор у Літве ахвяр на вызваленьне Вільні даў гэткія вынікі: У Шавельскім пав. сабрана 21.265.45 літаў, у Панявежскім—6.200 літаў, у Сэйнэнскім—3.803.59 літ., у Крэтынзе—6.562.17 л., у Ракішках—10.240.74 літ., у Вілкавышках—16.117.48.

Трактаты з Лякарна ў Лізе Народаў.

Дня 14 сьнежня Чэмбэрлен і Поль Бонкур перaказвалі Лякарнскія трактаты пад апеку Лігі Народаў. З гэтай прычыны паседжаньне набрала дужа урачысты настрой.

Усе з увагай выслухалі дэклярацыі скаданыя праз сяброў. Чэмбэрлен злажыў 5 трактатаў, а Поль Бонкур дапоўніў гэта, злажыўшы трактат польска-францускі. Усе прамоўцы падчыркавалі, што ў гісторыі Лігі Народаў пачынаецца новая эра яе ўнівэрсальнасьці і віталі блізкае ўжо ўступленьне Нямеччыны да Лігі Народаў. Потым Сцялёя запрапанаваў пераслаць пратакол паседжаньня Нямеччыне і Польшчы, прадстаўнікі якіх ня былі на паседжаньні.

Пісьмы з вёскі.

Бяз прычыны чэпяцца да людзей.

М. Ганцэвічы, Лунінецкага пав.

15 марца г. г. я вярнуўшыся з работы знашоў у сваей хаце трох паліцыянтаў і незнаёмага чалавека. На маё запытаньне, што ім трэба, гэты чалавек кажа, што ў яго на кірмашы прапала з возу бурка, дзеля таго, што конь стаяў у вашага суседа на панадворку і сусед указаў на вас, дык мы прышлі рабіць обыск. Калі я запытаў ардэру на обыск, то старшы пастарунковы пачаў крычаць, пасьля чаго я уступіў і паліцыянт Грабоўскі пачаў рабіць обыск. Мая матка стоячы каля печы (даставала мне абед) кажа, што, калі ня знайдзеце нічога, то дам качаргой (яна мае 70 г.); пачуўшы гэта кінулі рабіць обыск, узялі мяне ды і павялі на пастарунак, там забавілі ня доўга, бо пашлі ўзноў шукаць у маей хаце, дзе нічога не знашлі, а пратакол напісалі, што мы іх білі, не давалі рабіць обыску (як відаць яны спужаліся 70 гадовай кабеты). Судзьдзя сьледчы, зрабіўшы дазнаньне, перадаў справу ў акружны суд, а мяне пад надзор паліцыі, а за што дык я і сам ня ведаю.

М. Фількевіч.

Кругом безпраўе.

Мядзьведзіца, Баранавецкага павету.

У нас, як і ў кожнай гміне, ёсьць гмінная рада, якая павінна глядзець і бараніць інтарэсаў гміны і сваіх братоў грамадзян. Але ў нашай радзе якраз на адварот: кіруе ня рада гмінная, а войт радай, які прыехаў да нас ня ведама скуль. У нас год таму назад будынак гміны быў вялікі, зборная абшырная, у канцэлярыі хватала месца і ўсё было ў парадку, бо войтам быў свой чалавек—беларус. Цяпер-жа ў нас войтам нейкі быўшы памоцнік старасты, ну дык і апісаць трудна, што тварыцца ў гміне. Памясьціўся ён сам у гміне, а дзеля таго, што з яго вялікі пан, дык захацеў мець кватэру з 3 пакояў. Распарадзіўся ён, каб канцэлярыю памясьцілі ў зборнай, нарабіў там перагародак столькі, што заняў усю зборную, а дзе была канцэлярыя, памясьціўся сам. Цяпер нашы вяскоўцы мусяць чакаць на дварэ, як сабярэцца троха людзей.

На добры парадак бяз Рады нічога не павінна рабіцца ў гміне, а тут Рада нават не зацікавілася гэтым, а мо' і зусім ня ведала. Няхай з гэтага нашыя сяляне бяруць навуку, якіх людзей трэба выбіраць пры ўсякіх здарэньнях: што нам патрэбныя людзі, для якіх даражэй ёсьць патрэба сваіх братоў сялян, як ласка пана войта, прыехаўшага да нас ня ведама скуль.

Хачу я яшчэ разказаць чытачом аб нашай паліцыі. У лістападзе г. г. у нас было вясельле; калі хлапцы сабраліся ў хату і пачалі забавы, убегла туды двух паліцыянтаў, добра падпіўшых і давай каго папала таўхаць ручкамі ад шашак. Трусьлівейшыя палясцелі адзін праз другога з хаты, а частка асталася, якім паліцыянты аб'явілі, што яны арыштованыя. Пачалі дапрос, ну але, як нічога ня было, дык яны нічога і не даведаліся. Потым паліцыянты зрабілі так, што тых хлопцаў, якія адказвалі папольску, хоць і кепска, пусьцілі, а каторыя адказвалі пабеларуску —паставілі пад сценку ў рад і казалі, што павядуць на пастарунак каб выўчыць гаварыць папольску. Есьць у нас хлопец, які прыехаў з Польшчы і жыве ўжо 3 гады. Адважыўся ён нешта сказаць у абарону арыштованых беларусаў, што страшэнна ўзбурыла паліцыянтаў. Паразганялі яны беларусаў, а пачалі спаганяць злосьць на „палячку“, а дзеля таго, што ў двух не маглі даць рады, пазвалі яшчэ трох і ў пяці пачалі над ім зьдзекавацца. Разьдзелі яго і пацягнулі па гразі зьвязанага на пастарунак, б'ючы і прыгаварываючы: „мы табе пакажам, як бараніць беларусаў“. Тры тыдні посьля гэты хлапец пляваў кроўю.

Або як адзін паліцыянт заказаў у мястэчку, краўцу перашыць касьцюм; забіраючы касьцюм сказаў, што ня мае грошы, якія аддам пачакаўшы, Прашло больш як 3 месяцы, а грошы няма; калі кравец прышоў да яго за доўгам, то гэты паліцыянт завёўшы на кватэру набіў сколькі ўлезла і загразіў, што калі яшчэ асьмеліцца ўпомніцца за сваю працу, то дастане больш. Вось у якіх варунках мы жывем.

Мадзьведзевец.

ХРОНІКА.

Падгатоўка да сьпісу насяленьня. Адміністрацыя гатовіцца да сьпісу насяленьня, які мае быць зараз па Новым Годзе. Сьпіс гэты будзе рабіць спэцыяльныя „камісары“. Вот-жа на гэткіх камісараў просяць найболей польскіх урадаўцаў: вучыцеляў, пачтавікоў, гмінных пісарчукоў і гэтым падобных. Вядомая рэч, што такія камісары будуць з усіх сіл старацца, каб напісаць у нашым краі найбольш палякаў. Але нашыя людзі павінны быць стойкімі і дамагацца ўсюды, каб сьпіс быў зроблены па праўдзе і справядлівасьці.

— **Ападаткаваньне духавенства.** Міністар унутраных спраў пісьмом да Дэлегата Ураду выясьніў, што згодна з 15 арт. канкардату духавенства павінна аплачаваць усе падаткі нараўне з іншымі грамадзянамі дзяржавы. Дзеля гэтага усе падаткі ад духавенства будуць спаганяць з дн. 2 жніўні 1925 г. г. ч. ад уваходу ў жыццё канкардату.

— **Камуністычныя адозвы.** У панядзелак на Панарскай вул. каля дому № 65 на дзьвярах была вывешана камуністычная адозва у польскай мове. Праз ноч знайдзена на вул. Тартакі 42 шт., на вул. Крадкоўскай 15 шт. адозваў.

— **Справа Гурчына.** Справа абвінавачанага ў дэфраўдацыі (крыжы) б. падпракуратара Гурчына вызначана на дн. 8 студня.

— **Заразьлівыя хваробы ў Віленшчыне.** За час ад 4 да 15 сьнежня Дзяржаўны Урад Здароўя, на абшары віленскага адміністрацыйнага вокругу, занатаваў: 5 вып. тыфусу, 7—дыфтэрыту, 2—шкарлятыны, з чаго 1 сьмяротны, 2—воспы, 2—коклюшу, 5—трахомы.

— **Звальненьне з турмы Стаўбуняк.**

16 сьнежня выпушчана з горадзенскага вастрогу, дзе прасядзела каля паўгоду Кацярына Стаўбуняк, сэкрэтарка Беларускага Пасольскага Клюбу ў Пружанах. Дзякуючы не нармальным варункам у вастрозе Стаўбуняк падупала на здароўі і вельмі слаба чуецца. Стаўбуняк мае трое дзетак, аб каторых вельмі безпакоілася будучы ў вастрозе. Двое дзетак былі ў беларускім прытулку ў Вільні. Пасол Ярэміч перавёз Стаўбуняк у Вільню, дзе яна мае прабыць некулькі дзён, каб хоць троха паправіць сваё здароўе.

— **Рынкавыя цэны дн. 15-X-25 г.** Урад для барацьбы са спэкуляцыяй і дарагоўляй, паразумеўшыся з прадстаўнікамі віленскіх купцоў, устанавіў гэтакія цэны на прадметы першае патрэбы.

Гарбата за кілё	26—30	зл
„ у папер. пачках	24—32	„
„ у бляшаных	30—36	„
Кава паленая Гаутэмаля	16	„
„ „ Сонтос	12	„
„ „ Ріо	10	„
„ „ Сонтос Пэкт	4	„
Какао у россыпку	4— 7	„
„ у пачках	6—15	„
Цукер у косках I кат.	1.80	„
„ „ II кат.	1.65	„
„ крышталь	1.40	„
Мёд штучны	1.55	„
Мармаляда	2—3	„
Цыкорыя I кат. Глеба	1.50	„
„ II „ „	0.40	„
Рыж бурма	1.20	„
„ падуа	1.60	„
Гарох у палавінках	1 —	„
Фасоля	0.70	„
Хлеб белы кілё	0.55	„
„ сталовы	0.43	„
„ разовы	0.40	„
Каша манна амэрык.	1 —	„
„ гараховая цэлая	0.85	„
„ пэрловая дробная	0.95	„
„ „ срэдняя	0.75	„
„ „ пансак	0.60	„
„ гараховая цёртая	1 —	„
„ ячм. дробная	0.75	„
„ „ срэдняя	0.60	„
„ ягляная	0.75	„
Мука пшонная амэрык. пат.	1.10	„
„ „ I г. 0000	1 --	„
„ „ II г. 000	0.85	„
„ бульбяная	0.85	„
Макароны варшаўскія	1.90	„
„ влоскія	2.40	„
Соль белая	0.33	„
„ шэрая	0 25	„
Масла дэсэровае	8.30	„

Наша Пошта.

Тамашу Грыбу ў Празе: Пісьмо Ваша атрымалі. Дужа Вам дзякуем за прыхільнасць да нас і за добрыя словы. Чакаем на абяцанае.

Горскаму: Стацьці Вашы атрымалі. Яны дужа добрыя. Адну з іх друкуем у гэтым нумары.

Ст. Грынкевічу: Дзякуем, надрукуем. Пішыце да нас больш.

Н. Калядзе з пад Белавежы: „Сялянскую Ніву“ Вам пасылаем. Дзякуем за добрыя словы.

Н. Хаванскаму ў Баранавічах: І мы думаем, што газэта наша будзе Вам да ўспадобы. Пашырайце!

А. Більдзюкевічу сэкрэтару Белар. Пас. Клюбу: Стацьцю Вашу аб „Зямляробным крызісе“ мы атрымалі. Надрукуем пасля сьвят, бо цяпер ужо маемо матэр'ялу даволі.

Я. Пятроўскаму: 1 зл. на „Сялянскую Ніву“ атрымалі. Газэту высылаем.

Беларускай Гімназіі ў Клецку: 2 зл. атрымалі газэту пасылаем.

Сымону Двар'яніновічу: 6 зл. атрымалі, газэту пасылаем.

Агульны Сход Сяброў Т-ва Бел. Школы

У РАДАШКАВІЧАХ

назначаецца на дзень 27-га сьнежня 1925 году а 12-й гадзіне, у памяшчэньні **Беларускае Гімназіі ў Радашкавічах.** Калі на вызначаны час не зьбярэцца патрэбнага кворуму,—сход адкладаецца на 14-ю гадз. і адбудзецца пры ўсялякім ліку сабраных.

Парадак спраў: 1) Справаздача за мінулы год, 2) Выбары новага ўраду, 3) Папраўкі й дапаўненьні ў статуце, 4) Бягучыя справы.

(—) **Рада**

За Старшыню, сэкрэтар **Я. Гаўрылік.**

Рэдактар-Выдавец: **Ст. Вольскі.**

Друкарня **Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая вул. № 22.